**Н. Ф. МІХНО**,
настаўніца вышэйшай катэгорыі гімназіі № 2 г. Гродна

# ЯКУБ КОЛАС: ЖЫЦЦЁ, ТВОРЫ, ГЕРОІ

## (семінар-даследаванне, IX клас)

**Пазакласная работа — своеасаблівае выйсце са стану паўсядзённасці. Арыентуючыся на арыгінальнасць, яркасць, займальнасць, усё ж варта ўлічваць, што ў першую чаргу пазакласная работа праводзіцца для таго, каб замацаваць і паглыбіць аб'ём ведаў, вызначаны вучэбнай праграмай, а таксама дапоўніць цікавым, змястоўным матэрыялам, які істотна пашырыць уяўленне вучняў пра літаратуру, пра творы і творцаў. Важна сярод шматлікіх форм пазакласнай дзейнасці надаваць увагу тым, што развіваюць у вучняў самастойнасць, актыўнасць, уменні працаваць з літаратурай, сістэматызаваць матэрыял, аналізаваць яго, даюць магчымасць творча рэалізаваць сябе. Семінар-даследаванне — адна з такіх форм, якая прадугледжвае нетрадыцыйны, нестандартны спосаб арганізацыі працы. Як і большасць пазакласных мерапрыемстваў, ён патрабуе папярэдняй (2—3 тыдні) падрыхтоўкі:**

1. **Прапануецца тэма, выпрацоўваецца план.**
2. **Вызначаюцца віды дзейнасці, размяркоўваюцца заданні.**
3. **Рэкамендуюцца крыніцы інфармацыі, даецца папярэдняя кансультацыя.**

Мэта: глыбей пазнаёміць вучняў з асобай і творчасцю Якуба Коласа, развіваць уменне працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, даць магчымасць набыць даследчы вопыт; падтрымліваць цікавасць і павагу да нацыянальнай літаратурнай класікі.

### Ход семінара

**Уступнае слова настаўніка.**

Настаўнік. На паэтычным небасхіле беларускай літаратуры ззяюць тры яркія зоркі — Янка Купала, Якуб Колас і Максім Багдановіч. Кожны з іх — гэта цэлы свет вялікай, сусветна прызнанай літаратуры.

Пройдзем сцежкамі жыцця Якуба Коласа, перагорнем старонкі яго біяграфіі і творчасці, яшчэ раз узгадаем герояў коласаўскіх твораў і прасочым лёс прататыпаў яго славутых вобразаў-персанажаў.

**Дзе заканчваецца жыццё і пачынаецца літаратура?** Паспрабуем даць адказ на гэта пытанне. Як пісаў сам Якуб Колас: «У кожны момант і на кожнай мясцінцы зямлі адбываюцца найцікавейшыя рэчы і складаюцца самыя дзівосныя казкі, падобныя іншы раз да праўды, і нараджаецца праўда, яшчэ больш цікавая, чым сама казка».

**І блок семінара.**

**План семінара і арыентацыйны кластар**



Першая група даследчыкаў выступае з прэзентацыяй **«Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа»**.

Першы вучань *(чытае верш «Маці» Якуба Коласа і прапануе ўдзельнікам семінара расшыфраваць старонкі біяграфіі, адлюстраваныя ў творы)*.

Непрыветна цераз вокны
Ночка пазірае.
Ціха ў хаце. Ўся сямейка
Спіць, адпачывае.

Натрудзіўшы добра рукі,
Натаміўшы плечы,
Толькі маці з вераценцам
Туліцца пры печы

Ды прадзе, прадзе кудзельку.
Скача вераценца,
А за ім густыя цені
Бегаюць па сценцы.
. . . . . . . . . . . .
І пад лесу шум трывожны
Думае старая...
. . . . . . . . . . . . .
Вось і муж усплыў на думу —
Рана смерць скасіла!
Дробных дзетак ён пакінуў —
Без пары магіла!

Жыў ён бедна. Спадзяваўся
Свой прыдбаць куточак,
Хату вывесці, зямелькі
Прыкупіць шматочак...
. . . . . . . . . . . . . .
Уздыхнула цяжка маці,
Аб сынку гадае,
Што ў астрозе, ў паняверцы
Кару адбывае.

І за што? У толк не возьме
Бедная кабета
Ні законаў гэтых мудрых,
Ні парадкаў свету.
. . . . . . . . . . . . .
Думкі думку падганяюць,
Не даюць спакою,
Ўсё лятаюць над кабетай
Нуднай чарадою.

*1908*

Другі вучань. Маці — Ганна Юр'еўна — была з роду Лёсікаў. Колас успамінае: «Мяне заўсёды вабілі і крыху палохалі матчыны вочы. Добра яны глядзелі на нас, малых, але нібы наскрозь». Таму, калі дзеці рабілі нейкую шкоду, лепей было прызнацца самому,



Маці паэта.

бо маці ведала і так, хто вінаваты ў гэты час. А яшчэ ўражваў паэта матчын голас. Нават калі яна сварылася ці ўшчувала, голас не траціў мяккасці і дабраты. Яна ўмела прыгожа спяваць. Маці не карала дзяцей, хіба што хто-небудзь не хацеў маліцца або мыцца перад надзелькай. Працы і клопатаў у маці было шмат. У сям'і гадавалася дзявяцера дзетак (усіх нарадзілася 13 дзяцей, чацвёра памерлі малымі).

Бацька — Міхал Міцкевіч — прападаў на службе. Пасада лесніка давала добры кавалак хлеба, але быў той хлеб ненадзейны і цяжкі. І гэты цяжар заключаўся не толькі ў шматлікіх абавязках лесніка, не звязаных з леснікоўствам, а з тым, што панскі лес трэба было бараніць ад свайго брата-селяніна, часта суседа, сваяка.

Дзядзька Антось жыў у братавай сям'і. З-за беззямелля ён не ажаніўся і ўсё жыццё цягнуў «ярэмца хлебароба». Штодзённа заняты сялянскімі справамі, ён знаходзіў час



Бацька паэта. Мал. Л. Рана.





Альбуць.
Леснiковая пасада.



Акінчыцы.

забаўляцца з дзецьмі. Дзядзька апавядаў ім казкі, легенды, чытаў вершы.

Можа, таму дзеці з ранніх гадоў мелі павагу да слова, асабліва паэтычнага. Самі не пісалі, як Костусь, але дэкламавалі пранікнёна і Алесь, і Уладзік, і Юзік. Дзяўчаты Міхаліна, Юзэфа, Марыя і Алена з пашанай ставіліся да кнігі, нямала ведалі твораў на памяць. Дзядзька Антось абудзіў любоў да слова ў пляменнікаў і пляменніц — яны ўсё сваё доўгае і цяжкае жыццё добра памяталі вершы беларускіх, украінскіх, рускіх і польскіх паэтаў, а таксама свайго брата Костуся. Пра гэта распавядае нам Максім Лужанін у кнізе «Колас расказвае пра сябе».

Доўгі час у біяграфіі Якуба Коласа быў адзін прыхаваны факт. У сваёй аўтабіяграфіі 1956 года паэт пісаў, што з сям'ёй жыў другі брат Міхала — Пятрусь. Ён у свой час служыў у царскай арміі пісарам, быў адукаваным чалавекам, таксама любіў кнігу. Баючыся за сваё жыццё, у савецкі час ён выехаў за мяжу.

**II блок семінара. Аўтабіяграфічнасць творчасці.**

Першы вучань. Найбольш аўтабіяграфічны твор — паэма «Новая зямля», у якой знайшлі адлюстраванне многія падзеі з жыцця самога Якуба Коласа, яго сям'і. Не дзіўна, што прататыпамі герояў паэмы былі бацькі, дзядзька, браты і сёстры паэта. Звернемся да ілюстрацый. *(Дэманструецца прэзентацыя «Тэматычныя ілюстрацыі да паэмы».)*

Затым вучням прапануецца віктарына.

**Літаратурная віктарына (брэйн-рынг для творчых груп).**

1. Альбуць, Смольня, Акінчыцы, Цёмныя Ляды, Ласток, Мікалаеўшчына.

Злучыце гэтыя мясціны ў пэўным парадку. Куды сям'я Якуба Коласа ад яго нараджэння пераязджала? *(Акінчыцы → Ласток → Альбуць Цёмныя Ляды → Мікалаеўшчына → Смольня.)*

**2.** Якой мясціне прысвечаны наступныя радкі?

Каля пасады лесніковай
Цягнуўся гожаю падковай
Стары, высокі лес цяністы. *(Альбуць.)*

3. «Знаеце, што я вам скажу, — узрушана прамовіў ... — Беларускі верш — вось ваша сапраўднае прызванне! Тут ёсць жывасць, шчырасць і — калі хочаце ведаць — вастрыня, нават смеласць!» Хто і каму сказаў гэтыя словы? *(Выкладчык Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі Фядот Кудрынскі, які ўхваліў напісанае па-беларуску Канстанцінам Міцкевічам, будучым паэтам.)*

4. Пра каго пісаў Якуб Колас?

Яго ўся воласць наша знала,
Ён быў вядомы між панамі!
Ды што паны?! Сам князь Антоні
Не раз з ім меў размову.

*(Пра палясоўшчыка Міхала, які быў на службе ў магната князя Радзівіла.)*

5. Якому герою паэмы «хацелась жыць, ушыр разняцца, // За долю лепшую змагацца»? *(Міхалу.)*

6. Закончыце радкі паэмы.

1) Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці
Ды... *(бацька з дзядзькам, трэцця маці...)*

2) Наш дзядзька, мілы наш Антоні,
У... *(дзіцячым часта быў палоне...)*

3) А сам дарэктар, з вузел ростам,
У сваім... *(уборы бедным, простым...)*

г) Ну, як на смак, Антось, прызнайся?
Паскудства… *(брат, і не пытайся!)*

Трэці вучань. Як бачым, моцна было спалучана жыццё і творчая праца беларускага песняра з роднай Мікалаеўшчынай, ці, як у трылогіі «На ростанях», Мікуцічамі. З жыцця землякоў-мікалаеўцаў чэрпаў Колас матэрыял для сваіх твораў «Нёманаў дар», «Малады дубок», «У старых дубах».

Малюнкі прыроды і тапаграфія гэтых мясцін шырока паказваюцца як пейзажны фон у трылогіі «На ростанях». Героі твораў Якуба Коласа маюць сваіх прататыпаў.

Алесь Садовіч — гэта мікалаевец Сянкевіч, названы ён пісьменнікам па вясковай мянушцы — Садовы. Янка Тукала — гэта семінарскі таварыш Якуба Коласа Сямён Самахвал, а Тарас Шырокі — Тарас Гладкі, свержанскі настаўнік.

А калі нагадаць паэму «Новая зямля», дык наогул перад вачыма бачыш чароўнае, так любімае Коласам Наднямонне, тыя мясціны, дзе прайшлі дзіцячыя гады і юнацтва вялікага песняра. Толькі двойчы падзеі ў паэме «выходзяць» за межы Наднямоння: адзін раз, калі дзядзька Антось едзе ў Народны зямельны банк у Вільню, а другі — у Заблонне, кудысьці на поўдзень Случчыны, калі ляснік Міхал з братам едуць на агляд зямлі.

Сёстры Якуба Коласа ўспаміналі, што летам 1902 года Кастусь Міцкевіч вярнуўся з Нясвіжа пасля заканчэння вучобы і прывёз з кнігамі некалькі газет. Перачытваючы гэтыя газеты (відаць, «Мінскія губернскія ведамасці»), дзядзька Антось патрапіў на аб'яву, што за Слуцкам нейкая пані па частках прадае зямлю. Гэта навіна дужа запала ў душу бацькі, які даўно марыў разжыцца зямлёй. Вырашылі ехаць, але за чарадой спраў адразу паехаць не атрымалася, бо гэта ж больш за сто кіламетраў. А калі выбраліся ў Смольгава Пагосцкай воласці Слуцкага павета, то ўжо было трохі позна, бо зямлю купілі нейкія сяляне з-пад Мінска Іван Шаўчык і Мікалай Міхалевіч.

Праўда, мясцовыя жыхары параілі звярнуцца да іх, бо, можа, яны і прададуць кавалак зямлі. Як сведчыць сястра паэта Алена Міхайлаўна Лойка, Міхал з дзядзькам не толькі дамовіліся пра куплю з Міхалевічам, а нават далі задатак. З гэтага часу і пачаўся клопат: улезлі ў даўгі, распрадалі гаспадарку, узялі пазыку ў Віленскім зямельным банку. Калі ж браты другі раз завіталі ў Смольгава, каб зрабіць купчую і аддаць грошы, Міхалевіч змахляваў: не прызнаў, што атрымаў ужо задатак. У Міхала апусціліся рукі. Ён не ведаў, дзе шукаць праўды. Але дапамог цесць Юрка Лёсік, які адкупіў у Міхала кавалачак бацькаўскай зямлі, дапамог збыць тое-сёе з гаспадаркі.

Гэта было, напэўна, восенню 1902 года. Ужо пачалі збірацца на новае месца. Міхал папрасіў у ляснічага Ракоўскага (ён выступае ў паэме пад сваім прозвішчам) лесу на хату, бо з яе трэба было пачынаць. На што люты пан адказаў: «На хату не дам, а на дамавіну — калі ласка!» Не паспелі забыцца на клопат пра зямлю, як прыйшла бяда ў альбуцкую хатку лесніка Міхала Міцкевіча: 8 лютага 1903 года ва ўзросце 52 год ён памёр. Маці Ганна наадрэз адмовілася ехаць на нейкую Случчыну. Нават вырашылі зямлю прадаць, але, пакуль знойдзецца ахвотнік, дзядзька з пляменнікамі паехаў засяваць новае поле ўвесну. Родныя паэта сведчаць, што дзядзька Антось паўтара года правіў гаспадарку на новым месцы, нават гумно там паставіў. Потым Смольгава ўсё ж прадалі.

Як бачым, жыццёвая праўда бывае больш драматычнай, чым мастацкая.

**III блок семінара. Другая група даследчыкаў. Вучоба і праца.**

Першы вучань. Канец маленству прыйшоў, калі Кастусь выпадкова падслухаў размову бацькі з дзядзькам пра яго будучыню. Дарослыя разумелі, што душа хлапчука горнецца да навукі. Як сказаў бацька: «З тым, што ён умее, і ў пісарчукі не выб'ешся. А гаспадара з хлопца таксама не будзе. Хоць ён і рупны, і старанны, а пра сваё думае, усё цікуе, каб аднаму застацца».

На што дзядзька Антось зазначыў: «Падцягнем, Міхале, тужэй папружкі, а нешта зробім для хлопца. Наш век ужо канчаецца, а ён, можа, што людскае ўбачыць!» З гэтага часу Костусь асмялеў загаварыць з бацькам пра настаўніцкую семінарыю. «Прыклад быў, мікалаўцы прабілі ўжо сцежку ў гэту ўстанову». Як успамінаў сам Якуб Колас: «Падапранулі мяне чысцей, сабраў я свае кніжкі, маці перахрысціла. Пасадзілі на воз і — на экзамен. У семінарыю прыйшоў, як у храм. Няўжо я тут буду хадзіць і жыць у такім дзівосным месцы?»

У 1898 годзе паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. У семінарыі ў многім захаваўся дух бурсы, адносіны педагогаў былі



Ф. А. Кудрынскі
(1867—1933)

ў асноўным афіцыйныя. Але на жыццёвым шляху будучага класіка беларускай літаратуры сустрэўся Фядот Андрэевіч Кудрынскі, настаўнік рускай мовы. Ён абуджаў творчы дух навучэнцаў, выхоўваў іх на ўласным прыкладзе — педагога свайго часу. Менавіта ён падштурхнуў семінарыста Кастуся Міцкевіча да напісання твораў па-беларуску.

**Другі вучань.** Першым месцам яго працы стала вёска Люсіна. Якуб Колас як настаўнік такую пра сябе пакінуў памяць, што многія гады ўсіх настаўнікаў, якія прыязджалі туды, параўноўвалі з ім.

Якуб Колас належаў да тых педагогаў, у якіх любоў да дзяцей цесна паяднана з парадкам, дысцыплінай, патрабавальнасцю і добрымі, трывалымі ведамі. Люсінцы дзівіліся з Коласа: як гэта ён цалюткі дзень у школе. Вучні здавалі экзамен за народнае вучылішча лепш за іншых. Ён застаўся ў людской памяці эталонам настаўніка.

Адзін з былых вучняў Якуба Коласа ўспамінаў: «Ён ніколі не павышаў голасу, а цярпліва і спакойна вучыў нас чытаць, пісаць, рашаць задачы. І мы любілі свайго настаўніка». Другі вучань успамінае, што настаўнік вучыў іх спяваць народныя песні. Як вядома, беларускія песні спяваць у той час у школе было забаронена. Міхаіл Занька, былы вучань Якуба Коласа з Люсінскай школкі, успамінаў, што ў 1948 годзе некалькі вучняў звярнуліся да пісьменніка з просьбай дапамагчы ім пабудаваць новую школу, на што народны пісьменнік адказаў згодай і зрабіў усё магчымае, каб цераз год пачалося будаўніцтва школы.



Нясвіжская настаўніцкая семінарыя.

У творчай спадчыне Якуба Коласа трылогія «На ростанях» займае выключнае месца, бо над ёй пісьменнік працаваў амаль усё жыццё. Відаць, падзеі і людзі, паказаныя ў творы, не маглі доўга адпусціць творцу ад сябе: яны былі дарагія яму ўспамінамі, важнымі вехамі жыцця, здабыткамі і стратамі, паколькі твор з'яўляецца аўтабіяграфічным. Задуму трылогіі літаратуразнаўцы звычайна адносяць да часу працы Якуба Коласа на Палессі, калі ён прыехаў працаваць настаўнікам пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ў вёску Люсіна і калі настаўніку было толькі 20 год. Над першай кнігай «У палескай глушы» пісьменнік працаваў у 1921—1922 гг., упершыню яна была надрукавана ў Заходняй Беларусі ў 1923 годзе, толькі ў 1927 годзе ў БССР.

У аснове трылогіі многія падзеі, хоць і паказаны як мастацкае абагульненне, мелі месца ў жыцці самога пісьменніка, яго блізкіх і знаёмых. Шырока выкарыстаны ў творы ўласныя фальклорныя і этнаграфічныя запісы, зробленыя ў час працы на Палессі.

Аўтабіяграфічны вобраз і галоўнага героя твора Андрэя Лабановіча. Трэба зазначыць, што спачатку галоўны герой меў нават імя Андрэй Міхайлавіч, але потым, у час праўкі і «вызвалення ад рыс біяграфізму», герой стаў Андрэем Пятровічам. Многія старонкі сваёй біяграфіі пісьменнік аддаў галоўнаму герою аповесці «У палескай глушы» (ды і трылогіі!): настаўніцтва на Палессі, удзел у пратэсных выступленнях, у нелегальным настаўніцкім з'ездзе, звальненне з пасады, суд, турэмнае зняволенне і інш.

Галоўны герой трылогіі Андрэй Лабановіч вельмі падобны да свайго стваральніка рысамі характару, душэўным складам, нават знешнім выглядам.

Большасць герояў трылогіі, як ужо гаварылася, мае сваіх прататыпаў. Адны з іх выступаюць у творы пад уласнымі прозвішчамі і імёнамі, другія — пад крыху ці зусім зменымі.

Якуб Колас вельмі дакладны ў перадачы назваў мясцовасці, прозвішчаў, якія часта

сустракаюцца ў тым месцы, пра якое апавядаецца ў творы.

Праўда, Люсіна — першае месца працы Якуба Коласа — у аповесці названа Цельшына, але тыя адметныя прыкметы, уласцівыя вёсцы, адразу адгадваюцца. Назвы суседніх паселішчаў (Сяльцо, Татарка, Завітанкі, Целяшоў дуб) выразна сведчаць, што гутарка ідзе пра Люсіна.

Падзеі ў першай аповесці адбываюцца прыкладна ў 1902—1904 гадах, калі малады настаўнік прыехаў у глухую палескую вёску навучаць дзяцей грамаце. Тое, што турбавала самога Коласа-настаўніка, мы бачым і разумеем на прыкладзе яго літаратурнага героя. Лабановіч, як і сам Колас, цалкам аддае сябе працы. Гэта яго надзвычай важны жыццёвы абавязак, бо ён перакананы, што навука, асвета здольны істотна перайначыць, змяніць народнае жыццё. Пісьменнік упарта падкрэсліваў, што настаўнік Лабановіч не шкадаваў сваіх маладых сіл і стараўся добра падрыхтаваць дзяцей, каб тыя з годнасцю вытрымалі экзамен. Пётр Балук, былы вучань Якуба Коласа, успамінаў: «За першую зіму Канстанцін Міхайлавіч падрыхтаваў чатырох хлопчыкаў да экзаменаў. У час экзаменаў ён вельмі хваляваўся, але мы ўсе здалі добра. Незадаволены быў толькі бацюшка, што слаба ведалі "Закон Божы"».

Як і сам Колас, Лабановіч належыць да тых людзей, хто кіраваўся высокімі ідэаламі, усведамляў пачуццё абавязку перад народам. Сутнасць жыццёвай мэты любімага героя Коласа заключаецца ў тым, каб заўсёды быць у духоўным пошуку, імкнуцца выканаць сваё чалавечае пакліканне і прызначэнне — быць карысным людзям і роднаму краю.

**Чацвёрты блок семінара. Трэцяя група даследчыкаў.**

Першы вучань. Вельмі прыгожыя і рамантычныя старонкі аповесці «У палескай глушы» прысвечаны каханню Андрэя Лабановіча да Ядвісі. Лабановіч аддаў перавагу менавіта Ядвісі, а не панне Марыне ці Людміле, бо дзяўчына прываблівала яго багаццем і мнагалучнасцю натуры.

Вядома, што ў Люсіна Якуб Колас сустрэўся з сям'ёй Ігната Баранцэвіча, родам з Гродзеншчыны. Гэта быў пан падлоўчы, як ён сам казаў, са старога шляхецкага роду. Тутэйшае жыхарства лічыла яго палякам, сам жа пан падлоўчы з гэтым не згаджаўся. «Я — ліцвін», — з гонарам зазначаў пан падлоўчы, і сваю прыналежнасць да ліцвінаў даводзіў, між іншым, тым, што яго прозвішча — Баранкевіч.

Літаратурная крытыка вызначае вобраз пана падлоўчага ў творы Якуба Коласа як чалавека жорсткага і дэспатычнага. Бесчалавечны характар бацькі Ядвісі звёў заўчасна ў магілу яе маці, першую жонку пана падлоўчага. Якуб Колас фактычна акцэнтуе ўвагу на негатыўным. Гісторыя сям'і Ігната Баранцэвіча няпростая, але, насамрэч, узнікае пытанне: хто быў зацікаўлены ў такім падыходзе? Магчыма, сам Колас быў пакрыўджаны на пана падлоўчага, што ён не надаваў сур'ёзнага значэння нейкаму вясковаму настаўніку і не бачыў у ім партыі для сваёй дачкі. Якуб Колас не быў прадстаўніком старога шляхецкага роду, не быў і ліцвінам.

Сваю гераіню ў аповесці пісьменнік надзяляе найлепшымі чалавечымі якасцямі. Яна ўступала знешнім выглядам іншым дзяўчатам-паляшучкам, але вызначалася чалавечай годнасцю, паэтычнасцю натуры, моцным характарам, здольнасцю думаць, аналізаваць і прымаць рашэнне. Гордая па натуры, яна асабліва ні з кім не магла падзяліцца сваім клопатам і душэўнымі пакутамі, таму самастойна выпрацоўвала ўласныя ідэалы, перакананні.

Лабановіч таксама зацікавіў Ядвісю, хутчэй, не знешнасцю, а ўнутранай сваёй сутнасцю. Ён вылучаўся сярод тых, з кім сустракалася, каго ведала раней, імпанаваў дзяўчыне сваімі жыццёвымі поглядамі, настроямі, думкамі.

У гэтым дзіўным каханні было ўсё: трапяткая надзея на ўзаемнасць, радасць сустрэч, рэўнасць, шчасце прызнання, першага пацалунку, боль непаразуменняў, імкненне ўкалоць адно аднаго. Усё як у жыцці.

Чаму ж лёсы і дарогі людзей, якія кахалі, разыходзяцца? Кожны пайшоў сваім шляхам, памкнуўся ў сваю далячынь. Але гэта сустрэча пакінула значны след у іхніх сэрцах.

Асабліва яскрава мы бачым гэта на жыццёвых дарогах прататыпаў галоўных герояў — Канстанціна Міцкевіча (Якуба Коласа) і Ядвігі Баранцэвіч (такое сапраўднае прозвішча).

Ядвіга ў 1906 годзе выходзіць замуж за Канстанціна Бахенскага, з якім пражыла на Слонімшчыне доўгае жыццё, нарадзіла траіх дзяцей.

Другі вучань. Дзякуючы даследаванню Сяргея Кузняцова, дактаранта Варшаўскай акадэміі, мы можам падрабязна ўзнавіць лёс сям'і пана падлоўчага Ігнацыя Баранцэвіча.

Сапраўды, пан падлоўчы быў родам з дваран. Сям'я яго маці з Камароўскіх, што мелі



Маладая Ядвіга з мужам. 1906

графскі тытул. Маці ведала некалькі моў. Скончыла музычную школу.

У 1888 годзе пасля жаніцьбы Ігнацыя Баранцэвіча з Марыяй Немчыновіч у сям'і нарадзілася дачка Ядвіга, праз два гады — Габрыэля, пазней яшчэ чацвёра дзяцей, але дзяўчынкі памерлі, а хлопчыкі Ян і Чэслаў папоўнілі сямейства ляснічага Баранцэвіча. Сям'я пакідае Слонімшчыну і пераязджае ў Люсіна, дзе пан Баранцэвіч паступіў на службу ў лясную гаспадарку графа Патоцкага. Праз два гады пасля пераезду жонка памерла, пакінуўшы падлоўчага з чатырма дзецьмі. У 1900 годзе Ігнацый ажаніўся другі раз. Дочкі, якія без маці жылі часова ў бабулі, вярнуліся ў Люсіна, куды і прыехаў малады настаўнік Якуб Колас.

Напрыканцы першай аповесці «У палескай глушы» мы даведаемся, што Ядвіся пакідае Цельшына (Люсіна) і едзе на Гродзеншчыну да сваякоў.

Як жа склаўся лёс прататыпаў славутых коласаўскіх герояў?

Ядвіся, як мы ўжо і адзначалі, выйшла замуж за Канстанціна Бахенскага, ляснічага ў графа Патоцкага ў 1906 годзе. У сям'і нарадзілася трое дзяцей: дочкі Зося і Аліна і сын Багдан. Сям'я жыла ў Тухавічах, што між Слонімам і Баранавічамі, дваццаць гадоў. У Слоніме атрымлівалі адукацыю дочкі, а сын вучыўся на ляснічага ў Жыровічах. У 1939—1940 гадах сям'я жыла ў Баранавічах, а пазней Ядвіся з дачкой падалася на Захад і ўсё сваё астатняе жыццё пражыла ў Польшчы. Апошнім месцам жыхарства стала Лодзь, дзе Ядвіся памерла ў 1955 годзе, перажыў Якуб Колас «прыгажэйшую кветку Палесся» менш чым на год.



Ядвіга Бахенская (Баранцэвіч), в. Тухавічы, канец 1920-х

Яшчэ больш трагічны лёс быў у сястры Ядвісі — Габрынькі. Яна двойчы была замужам. Спачатку яе першага мужа Юзафа Баевіча як аўстрыйскага падданага выслалі ў Сібір, але потым сям'і ўдалося злучыцца.



Габрыэля Баранцэвіч. 1908

У сям'і гадавалася трое дзяцей. У 1919 годзе мужа забілі бальшавікі, а яе чакаў тыф, растанне з дзецьмі. Недзе ў 1925 годзе Габрыэля выходзіць замуж за адстаўнога вайскоўца Стэфана Серафіна. У другім шлюбе ў яе было чацвёра дзяцей. Новая сям'я жыла бедна, працуючы на зямлі. Бахенскія жылі ў большым дастатку. Ядвіга матэрыяльна падтрымлівала сям'ю сястры Габрыэлі. Але ў хуткім часе пачалася вайна. Гора прыйшло раней. Мужа Габрыэлі рэпрэсіравалі перад вайной, не забылі і пра сям'ю, якая апынулася ў пасёлку Уйма пад Архангельскам на лесапавале. Там яны цярпелі і голад, і холад. Ад безвыходнасці Габрыэля напісала ліст Якубу Коласу, нават не пазначыўшы адраса на канверце. Аднак ліст дайшоў. У адказ прыйшла пасылка з рэчамі і прадуктамі і кнігай «У палескай глушы». Прачытаўшы кнігу, Габрыэля даслала яе сястры Ядвізе. Пасылкі ад Якуба Коласа прыходзілі рэгулярна да чэрвеня 1941 года. Сям'я Габрыэлі трапіла ў Афрыку, у Танганьіку, дзе была створана вёска для польскіх перасяленцаў. Габрыэля, дзякуючы свайму сыну, які быў рэкрутаваны ў брытанскую армію, змагла пераехаць з Афрыкі ў Вялікабрытанію. Яна пражыла доўгае, але пакутнае жыццё. Памерла ў Канадзе, маючы 96 год. Яна пахавана ў горадзе Хадэрсфілд у Англіі.

Нашчадкі Ядвігі і Габрыэлі жывуць у Польшчы, Вялікабрытаніі, Ірландыі, Канадзе.

Дачка Габрыэлі Крысціна Прыёмка Серафін пасля паездкі ў Танзанію заснавала фонд, а ў ваколіцах афрыканскай вёскі, дзе вырасла сама, — прытулак для танзанійскіх дзяцей, маці якіх знаходзяцца ў турмах. У 2008 годзе ўнучка пана падлоўчага за сваю грамадскую дзейнасць стала лаўрэатам узнагароды імя Высокага камісара ААН па правах чалавека, прымала ўдзел у здымках дакументальнага фільма «Афрыка майго дзяцінства».



Габрыэля Серафін (Баранцэвіч) з наймалодшым унукам Раманам. Канада. 1982

Відаць, Якуб Колас моцна кахаў Ядвісю, першае каханне не адпускала яго. Калі выпадкова ў яго жыцці аб'явілася Габрыэла (Габрынька — сястра Ядвісі), Колас прыняў самы шчыры ўдзел у яе лёсе.




Афіша польскага дакументальнага фільма «Афрыка майго дзяцінства».

**Пяты блок семінара. Чацвёртая група даследчыкаў. Чалавек, грамадзянін, творца.**

П е р ш ы   в у ч а н ь. Па-сялянску моцны, каржакаваты, нетаропкі, як часам здавалася, суровы, але калі пачнеш гутарку, то адчуваецца ў ім мяккасць і дабрыня, глыбокая павага да чалавека. Такім Якуб Колас запомніўся многім. У адносінах з людзьмі ён вызначаўся рэдкай абавязковасцю і дакладнасцю. «Я не ведаю выпадку, калі б ён, напрыклад, не адказаў на пісьмо ці не зрабіў чаго-небудзь, што абяцаў зрабіць. Шчырая, сардэчная ўвага да людзей была важнейшай рысай характару на працягу ўсяго жыцця, — успамінае перакладчык Пётр Сямынін. — На рабочым стале стаяла плеценая з саломы шкатулка, поўная нейкіх паперак. Аднойчы парыў ветру зваліў гэту шкатулку на падлогу і адтуль высыпаліся паштовыя квітанцыі на грашовыя пераводы ва ўсе канцы Савецкага Саюза. Ведаючы пра чалавечую дабрыню паэта, да яго па дапамогу звярталіся многія людзі і знаёмыя, і незнаёмыя». Пра гэта пісала і ўнучка Якуба Коласа Алена Міцкевіч: «Мой дзед не быў скупы і багаты... У маім уяўленні — гэта добры

і шчыры чалавек. І, вядома ж, таленавіты і працалюбівы».

Пасылаў грошы Якуб Колас пагарэламу чыгуначніку, калгасніцы, ад якой адрокся сын, на лячэнне, Тацццяне Замоцінай (дачцэ акадэміка І. І. Замоціна, рэпрэсіраванага ў 1930-я гады), Вандзе Лявіцкай, дачцэ пісьменніка Ядвігіна Ш., якая, дарэчы, прыгадала і такі факт з жыцця паэта. Калі ён аднойчы пайшоў на базар купіць воз дроў, то пачуў жаночы плач. У хуткім часе даведаўся, што ў дзяўчыны нехта ўкраў апошнія грошы. Столькі было гора ў яе вачах, што Якуб Колас аддаў ёй грошы, што меўся патраціць на дровы. Дзяўчына, расчуленая, нават не спытала, хто ён. Праз нейкі час бацькі дзяўчыны прывезлі паэту цэлы воз дроў.

Яшчэ раз вернемся да факта дапамогі Якуба Коласа рэпрэсіраванай сястры Ядвісі Габрыэле. Справа ў тым, што ўчынак паэта не проста дапамога знаёмаму чалавеку, а грамадзянскі подзвіг, на які не кожны мог рашыцца. Каб зразумець гэта, трэба добра ўзгадаць гістарычныя рэаліі таго часу, часу рэпрэсій. Жыццё многіх пісьменнікаў тады вісела на валаску. Цяпер вядома, што гадамі ў хаце Якуба Коласа ля парога стаяў спакаваны чамаданчык: пісьменнік штодзень чакаў арышту. Былі не толькі асобныя ночы, але і цэлыя тыдні, калі ён спаў не распранаючыся.

Такіх выпадкаў у жыцці Якуба Коласа было шмат. Дом іх быў заўсёды адчынены для ўсіх. Кожнаму знаходзілася добрае слова, маральная, а, часцей за ўсё, і матэрыяльная дапамога. Хаця, як успамінае Ванда Лявіцкая, самі яны жылі проста, нічога лішняга, толькі самае неабходнае і зручнае. Часам прыходзілася цяжка, Марыя Дзмітрыеўна, жонка паэта, зводзіла канцы з канцамі, але разумела мужа, чутка адклікалася на чужое гора, памагала людзям. Колас заўсёды быў актыўным грамадзянінам свайго краю, належаў да тых энтузіястаў, хто ўсё рабіў для адраджэння беларусаў.

**Заключнае слова настаўніка.**

Настаўнік. На гэтым наша літаратурнае падарожжа па коласаўскіх сцежках жыцця і творчасці заканчваецца. Вы правялі цікавую даследчую працу, зробім падсумаванне. Вашай увазе прапануецца некалькі выказванняў. Якім з іх вы закончылі б наш семінар і чаму? Можна пашырыць выбраны варыянт ці прапанаваць свой.

1. Жыццёвы шлях Коласа і яго герояў — гэта заклік шукаць і верыць, заўсёды насіць у сабе «высокае неба ідэалу», імкнуцца да яго.

2. Якуб Колас сваім талентам даказаў, што жыццёвая праўда, калі ахінуць яе дасканалай формаю і адцяніць яскрава тым ці іншым светапоглядам, можа пераўтварыцца ў яскравы і глыбокі мастацкі твор, над якім няўладны час.

3. Яго розум увабраў назапашаную стагоддзямі народную мудрасць, яго сэрца верыла ў зямлю і людзей зямлі. А таму яго творы — наша нацыянальная каштоўнасць, прызнаная светам.

4. Коласаўская «лінія» ў літаратуры — гэта традыцыя гуманізму, праўды жыцця, увасабленне духоўнасці, услаўленне красы і веліччы роднай зямлі.

Вучні выказваюць свае меркаванні і аргументы.

Настаўнік. Хочацца скончыць нашу сустрэчу пажаданнем Якуба Коласа: «Жывіце даўжэй! Хай кожны дзень ваш сяброе ці з пачаткам, ці з заканчэннем якой-небудзь добрай справы».

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

*Александровіч, С. Х.* Тут зямля такая / С. Х. Александровіч. — 2-е выд., дап. і дапрац. — Мінск : Нар. асвета, 1985. — 256 с.

*Бельскі, А. І.* Класікі і сучаснікі ў школе: вывучэнне творчасці пісьменнікаў / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005. — 352 с.

*Жыгоцкі, М.* Прыйшоў у жыццё дзеля нас: нататкі пра лёс і творчасць Якуба Коласа / М. Жыгоцкі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. — 151 с.

*Колас, Я.* На ростанях : трылогія / Я. Колас. — Мінск : Маст. літ., 2019. — 653 с.

*Кузняцоў, С.* Лёс сям'і пана падлоўчага: Ядвіся з трылогіі «На ростанях»: што з ёй стала / С. Кузняцоў // Наша ніва. — 2014. — 12 крас. — Рэжым доступу : *nn.by.>?=dr&=126017*

*Мальдзіс, А.* На таленты ўрадлівая зямля / А. Мальдзіс // Беларус. мова і літ. у шк. — 1988. — № 4. — С. 32—33.

*Міцкевіч, А.* «Мой дзед не быў скупы і багаты...» / А. Міцкевіч // Беларусь. — 1992. — № 11. — С. 17.

*Міцкевіч, В.* Якуб Колас: пясняр зямлі і неба Беларусі / В. Міцкевіч. — Мінск : Харвест, 2016. — 63 с.

Якуб Колас. У думках, у сэрцах, у песнях : успаміны, нарысы, эсэ, прысвячэнні / уклад. М. Міцкевіч. — Мінск : Маст. літ., 2012. — 607 с.